# У гонар паэтак

Літаратурная імпрэза, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння беларускай літаратуразнаўцы, паэткі, празаіка і грамадскага дзеяча Валянціны Коўтун, прайшла ў Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы.

Творчасць і жыццё знакамітай землячкі ўспаміналі мясцовыя паэты, артысты Палескага драмтэатра, навучэнцы Пінскага каледжа мастацтваў, прадстаўнікі рэлігійных устаноў горада і раёна. Прысутныя ўшанавалі памяць былой вучаніцы і настаўніцы Малоткавіцкай СШ. З прэм'ерай песні — балады «Друзі» — выступіў Аляксей Андрухін, які паклаў на музыку пранікнёныя радкі Валянціны Міхайлаўны львоўскага перыяду яе творчасці.

На сустрэчу з Мінска прыехалі сын паэткі Міхаіл Новік з жонкаю Вольгай. Мадэратар вечарыны «Абяцай Радзіме слова» — краязнаўца, экскурсавод і публіцыст Таццяна Хвагіна, якая пазнаёміла прысутных з цікавымі біяграфічнымі звесткамі пісьменніцы, запрасіла прайсціся творчымі сцяжынкамі. Як было не парадавацца за нашу зямлячку, успаміны пра якую пакінулі Расул Гамзатаў, Уладзімір Караткевіч, блізкая сяброўка Яўгенія Янішчыц!

На Піншчыне, дарэчы, праходзіў рэгіянальны літаратурны конкурс сярод школьнікаў «Прысягаю роднаму краю», прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння Валянціны Коўтун і Валянціны Локун. Неўзабаве ў гонар гэтых літаратарак на будынку Малоткавіцкай СШ, дзе яны абедзве вучыліся, будзе ўсталявана мемарыяльная дошка.

**Тамара ШЧАРБАКОВА**